Агляд фонда асабістага паходжання Ватацы Н.Б.

Галоўны бібліёграф НДА кнігазнаўства Белы А.В.

У 2008 г. спаўняецца сто гадоў з дня нараджэння буйнешага беларускага бібліёграфа, кнігазнаўцы – Ніны Барысаўны Ватацы.

Ватацы Ніна Барысаўна (крыпт Н.В., друкавалася таксама пад прозвішчам свайго мужа Н. Саўчанка, нарадзілася 14.05.1908 г. у горадзе Вендэні Ліфляндскай губерніі (цяпер горад Цэсіс, Латвія) у сям'і служачых: бацька – юрысконсульт, маці – настаўніца (выкладчыца анатоміі). У 1932 г. Н. Ватацы скончыла сямігодку. З 1926 г. у Мінску. Працавала ў краязнаўчым музеі мастаком і самастойна рыхтавалася па праграме агульнаадукацыйных курсаў, якія ў той час замянялі старшыя класы сярэдняй школы. У 1927 г. паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта. Скончыла універсітэт у 1930 г. і была накіравана ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі) у 1930-1936 гг. і ў 1945-1990 гг. працавала на пасадах ад памочніка бібліятэкара да галоўнага бібліёграфа. У 1936 г. быў арыштаваны яе муж, Аляксандр Іванавіч Саўчанка, член КПСС з 1918 г., які пісаў дысертацыю пра З. Бядулю. Таму Н.Б. Ватацы з канца 1936 г. да 1941 г. вымушана была працаваць у Архангельску – у краявой бібліятэцы, пасля мастаком у майстэрні ў г. Кіраве. Жыла ў г. Ульянаўск, дзе працавала ў педвучылішчы. У час вайны на фронце загінуў муж. Сама Н.Б. Ватацы ў гады вайны загадвала бібліятэкай эвакшпіталя ў г. Мелекесэ Ульянаўскай вобласці (1942-1945 гг.). У 1945 г., суправаджаючы раненага, вярнулася ў Мінск, зноў стала працаваць у Дзяржаўнай бібліятэцы галоўным бібліёграфам аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі. Узнаўляла фонды бібліятэкі. У 1946-1956 гг. па сумяшчальніцтву выкладала на бібліятэчным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута. Член КПСС з 1945 г. Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1963). Член СП СССР з 1979 г.

Першы артыкул "Кніжная вокладка ДзВБ" Н. Ватацы апублікавала ў часопісе "Кніга – масам" у 1932 г. З таго часу сістэматычна працуе ў галіне беларускай літаратуры, бібліяграфіі і складання летапісаў жыцця і творчасці беларускіх пісьменнікаў. На працягу многіх гадоў вяла пошукі невядомых твораў і фактаў з жыццёвай і творчай біяграфіі М. Багдановіча. Даследаванні Н. Ватацы вылучаюцца глыбокім пранікненнем у матэрыял; у артыкулах пра творчасць беларускіх пісьменнікаў пошук даследчыка спалучаецца з грунтоўным аналізам літаратурных з'яў.

Склала бібліяграфіі "Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі" (за 1917-1960 гг. - 1962; за 1961-1968 гг. - 1971), "Беларускае савецкае літаратуразнаўства і крытыка. 1945-1963" (1964), "Беларуская савецкая драматургія. 1917-1965" (1967), рэкамендацыйны бібліяграфічны даведнік "Белорусская литература" (з М.Каваленка, Р.Сіпаковай, Масква, 1988),

бібліяграфічныя даведнікі і памяткі пра творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, К.Чорнага, К.Крапівы, М.Лынькова, П.Глебкі, П.Труса, П.Пестрака, І.Шамякіна, П.Панчанкі, многіх іншых беларускіх аўтараў). Аўтар бібліяграфічнага даведніка "Максім Багдановіч" (1961), альбома-выстаўкі (з А.Лойкам, 1968), шэрага артыкулаў, складальнік зборніка ўспамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра М.Багдановіча "Шлях паэта" (1975), працы "Максім Багдановіч: Паказальнік твораў, аўтографаў і крытычнай літаратуры" (1977). Напісала брашуры "Лев Толстой и Белоруссия" (з Н.Лапідусам, 1978), "Пушкин и Белоруссия" (1979). Аўтар кніг "Песня Максіма" (1981), "Шляхі" (1986). Узнагароджана медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. [1].

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі існуе фонд асабістага паходжання гэтага выдатнага чалавека, які пaступіў на захаванне ў 1998 г. і захоўваецца ў аддзеле рукапісаў, старадрукаў і рэдкай кнігі (цяпер - навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства). Фонд быў створаны на аснове дакументаў, якія засталіся пасля смерці Н. Ватацы ў 1997 г. Матэрыялы паступілі ў здавальняючым стане, раней не апрацоўваліся.

На жаль, рукапісная частка фонду малаколькасная. У асноўным гэта артыкулы і прадмовы ў энцыклапедыі, газеты, часопісы, якія прысвечаны Максіму Багдановічу; яго бібліяграфіі.

Перапіска складаецца з дзвух груп матэрыялаў: лісты фондаўтваральніку (значная колькасць) і лісты фондаўтваральніка (непараўнальна менш). Сярод адрасантаў такія выбіітныя асобы, як Я. Брыль, М. Улашчык, Людвіка Сівіцкая-Войцік (літаратурны псеўданім – Зоська Верас), У. Дубоўка, Я. Брыль і іншыя. Багата лістоў да Н. Ватацы ад бацькі, пляменніка і неўстаноўленых асоб. Лістоў ад фондаўтваральніка няшмат.

Амаль усё сваё жыццё Н.Б. Ватацы прысвяціла пошуку твораў і складання бібліяграфій М. Багадановіча. Таму захавалася перапіска з нашчадкамі Какуевых (сям'я з якой сябравала сям'я Багдановічаў у Яраслаўлі) – Лілеевымі. У 1971 г. Міністэрства культуры БССР атрымала ліст з Ленінграда ад Мікалая Іванавіча Лілеева, які паведамляў, што ён мае экземпляр кнігі М. Багдановіча "Вянок" з аўтографам паэта і прапануе аддаць яго на радзіму паэта. Пісьмо было перададзена ў Дзяржаўнаю бібліятэку БССР імя У.І. Леніна, і дырэкцыя бібліятэкі прапанавала купіць кнігу. Мікалай Іванавіч прыслаў кнігу ў дарунак Дзяржаўнай бібліятэцы, дырэкцыя бібліятэкі адказала падзякай [2].

На кнізе лаканічны аўтограф М. Багдановіча: "Николаю Рафаиловичу Кокуеву от автора. М. Багданович. Яросл. 1914". Цяпер гэты каштоўны экземпляр з надпісам, напісаным каліграфічным почыркам уласнаю рукою М. Багдановіча, захоўваецца ў навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства НББ. Міхаіл Рафаілавіч Какуеў, якому М. Багдановіч падарыў сваю кнігу, - яраславец, гімназічны таварыш паэта і родны дзядзька Мікалая Іванавіча Лілеева. Дзякуючы ўспамінам М.І. Лілеева, Д. Дзяболькага (бліжэйшага таварыша М. Багадановіча) Н.Б. Ватацы ўстанавіла, што вершы, прысвечаныя

Ані, носяць аўтабіяграфічны характар (Ганна Рафаілаўна Какуева, сястра гімназічных таварышаў М. Багдановіча Рафаіла і Мікалая Какуевых). Менавіта ёй і прысвечаны ўвесь цыкл "Мадонна" [3].

Больш шырока прадстаўлена частка дакументаў да біяграфіі. Захаваліся пасведчанні на медалі "За доблестный труд в Великую Отечественную войну 1941-1945 гг.", "За трудовую доблесть", "Ветеран труда". У архіве ёсць членскія білеты ОСВОДа БССР, ДОСААФа, Добровольного пожарного общества, прафсаюзныя білеты за розныя гады, пасведчанні пенсіянера, працоўнае. З-за таго, што Н.Б. Ватацы працавала у краявой бібліятэцы, пасля мастаком у майстэрні ў г. Кіраве, працавала ў педвучылішчы і ў бібліятэцы эвакшпіталя, то засталіся даведкі пра гэта.

Шмат дакументаў, якія прысвечаны да святкавання асабітсых і бібліятэчных юбілеяў і прафісійных дасягненняў ад дырэкцыі Дзяржаўнай бібліятэкі за розныя гады, сакратарыята Саюза пісменнікаў СССР, сакратарыята Саюза пісьменнікаў БССР, калектыва Інстытута літаратуры АН БССР, музея Я. Купалы, музея М. Багдановіча, Мінскага інстытута культуры, супрацоўнікаў Кніжнай палаты, Міністэрства культуры БССР (таксама за розныя гады).

У фондзе ёсць шматлікія фатаздымкі самой Н.Б. Ватацы, яе загінуўшага мужа, сваякоў, М. Багдановіча.

Трэба адзначыць, што Н.В. Ватацы дапамагала архіўнымі дакументамі стварыць музей М. Багдановіча. Такім чынам, архіўны фонд асабістага паходжання галоўнага бібліёграфа Дзяржаўнай бібліятэкі імя У.І. Леніна Ніны Барысаўны Ватацы адлюстроўвае жыццё гэтага найбуйнейшага спецыяліста і будзе цікавым даследчыкам, якія цікавяцца гісторыяй Нацыянальная бібліятэкі Беларусі; складальнікам біяграфічных і бібліяграфічных паказальнікаў.

Літаратура:


1. Савік, Л.С. Ватацы Ніна / Л.С. Савік // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / рэдкал. І.Э. Багдановіч і інш. – Мінск, 1992. – Т. 1: Абуховіч – Ватацы. – С. 539.
2. Шлях паэта: Зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра М. Багдановіча / склад. Н.Б. Ватацы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1975. – С. 278.
3. Шлях паэта: Зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра М. Багдановіча / склад. Н.Б. Ватацы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1975. – С. 283–285.